*абылгацыі.* І пусьціла іх аднойчы на вецер — палётаць. Вырваўшыся на волю, яны ўздымаліся й павольна падалі.

Няспраўджаныя мары, нязбытная вера. Недачаканая адплата. Папяровае займаньне людзкога даверу.

*Абылгацыі.*

## Авітаміноз

***Антаніна Хатэнка***

„*Вітаю*!" — усьміхаецца мне прыязьнік. „*Вітаю*!" — шапоча лістотаю мая зямля. *Прывітаньнем* поўныя прастора й час. Поўныя жыцьцём, бо *vita* — з прадалёкіх вякоў лацінян і ёсьць жыцьцё, сьвет-*вітамін*, які мы спажываем штохвільна.

Але ўсё часьцей паперадзе гэтага нягаснага *віта-* паўстае недарэчнае неразумнае *а-*. *Авітаміноз.*

Бач, якое адважнае гэтае *а*! Адпрэчвае самое красаваньне-наліваньне — жыцьцё. І мы паволі зьмірваемся, мы дазваляем упартай часьціцы адмаўленьня выракаць нас на пакуты, на балючую нястачу жыцьця. Ці згадваем калі, што самі творым жыцьцё? І што самі мы — ягоная ладная часьціна? Ці жывімся ратавальнай энэргіяй *віта*? Не!

Здаецца, нам, дзівакам, зручней жыць у бядноцьці, чымся адказна распараджацца заможным жыцьцём. І пануе ў пахмурным краі *авітаміноз*, недахоп жыцьцёвае сілы, прыгоства й веры.

А чаму паддаемся *авітамінозу*? Чаму не выбіраем чыстае, першароднае *віта*? Яно вядома, жаліцца прасьцей, чым выбіраць, а вінаватыя заўжды знойдуцца.

Пасьміхаецца зьдзеклівa *авітаміноз*: „Якія ж вы, чалавекі, хісткія, няўклюдныя здані, зьбялелыя безь *вітаміну* шчасьця".

Задрыгвела нашае беларускае шчасьце, *віта*-жыцьцё. І мы, як баязьлівыя зайцы на купінах, азіраемся — хто адымае *вітаміны*? Таго ж ня хочам прызнаць, што самі лянуемся скінуць зь сябе прычэпістую часьціцу *а-* ды чэрпаць нагбом *віта*-жыцьцё.

## Агмень

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Агмень* — слова, адроджанае досыць нядаўна. Калі Анатоль Сыс назваў ім свой паэтычны зборнік, гэта адразу было заўважана беларусамі на Захадзе, а Радыё Свабода адразу пракамэнтавала ягонае зьяўленьне. Аўтар камэнтару казаў, што *агменю* не фіксуе ніводзін слоўнік беларускай мовы, апрача „Расейска-крыўскага слоўніка" Вацлава Ластоўскага.

Адраджэнцы пачалі ўжываць слова *агмень* за некалькі гадоў да выхаду Сысавага зборніка. Перадусім таму, што былі нязгодныя з увядзеньнем у афіцыйны ўжытак немілагучнага *ачаг*. Хіба „*ачах*" можна было асацыяваць з агнём? *Агмень* быў адным з нашых гонараў, адной малой перамогай над палітыкай зрасейваньня беларускай мовы, якая вялася пры дапамозе савецкіх сродкаў масавай інфармацыі і „навукоўцаў", што ўводзілі ў нашую мову ўсялякія карандашы, бацінкі ці сьпічкі.